Источник: "Рэспубліка" - 2017-09-22



# ВЫТОКІ ПАЧЫНАЮЦЦА СА СЛОВА

**Крыху больш за месяц засталося да III з'езда РГА «Белая Русь». Пры падрыхтоўцы да гэтага мерапрыемства аб'яднанне ўважліва вывучае працэсы, якія адбываюцца ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і духоўнай сферах грамадства. Зараз па ўсёй краіне праходзяць тэматычныя «круглыя сталы». Іх серыю напярэдадні адкрыла ў Мінску сустрэча «Ад вытокаў дзяржаўнасці да IT-краіны», якая прайшла ў Нацыянальнай акадэміі навук.**



*Сяргей ПІГАРАЎ.*

Намеснік старшыні РГА «Белая Русь» Сяргей Пігараў адразу ж нагадаў, што на III з'ездзе аб'яднання будзе прынята новая праграма. Дапамогуць распрацаваць яе ў тым ліку і навукоўцы:

— Гэта не першы раз, калі мы звяртаемся па дапамогу да Акадэміі навук. Асабліва сімвалічна гэта ў Год навукі. Усе нашы сустрэчы мы нязменна праводзім з моладдзю. Можна колькі заўгодна гаварыць пра вернасць Радзіме, прасіць маладых не выязджаць з краіны, але да таго часу, пакуль мы не створым умовы для рэалізацыі ўсіх іх талентаў і магчымасцей, працэс будзе працягвацца. Сёння мы робім усё для таго, каб стварыць такія ўмовы.

Адзін з галоўных праграмных кірункаў работы аб'яднання — удзел у эканамічных праектах, абмеркаванне і аналіз заканадаўчых эканамічных ініцыятыў. Так што, запэўніў Сяргей Пігараў, прыміяніць свае сілы і веды ёсць дзе. Было б жаданне.

Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандр Каваленя звярнуў увагу на тое, што гэты Год навукі стаў багатым на падзеі: 1155-годдзе гісторыі беларускай дзяржаўнасці і 500-годдзе першай друкаванай беларускай кнігі. Таксама, паводле яго ацэнкі, толькі за апошнія пяць гадоў навукоўцы падрыхтавалі і выдалі больш за 26 тысяч навуковых прац, у тым ліку каля 570 манаграфій. Сёння аддзяленне гуманітарных навук працуе ў рамках адзінай комплекснай праграмы «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства». Толькі за першы год праграмы было выпушчана амаль 150 кніжных выданняў. Адным з самых значных і цікавых праектаў стаў «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы».

Удзельнікі «круглага стала» абмеркавалі значэнне развіцця інфармацыйных тэхналогій у старажытнай гісторыі краіны; пісьменства, кнігадрук і развіццё беларускай мовы; беларускую камп'ютарную лінгвістыку; уплыў штучнага інтэлекту на развіццё фінансава-банкаўскага сектара; спецыфіку выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у мовазнаўчых даследаваннях і іншае.

Дарэчы, сёння ў Гродне будзе праходзіць «круглы стол» на тэму «Праца РГА «Белая Русь» у эканамічнай сферы рэгіёнаў і краіны», на наступным тыдні ў Магілёве адбудзецца мерапрыемства «Праца РГА «Белая Русь» з моладдзю ў сістэме палітычнай падрыхтоўкі кадраў». А 12 кастрычніка ў Брэсце правядуць «круглы стол» «РГА «Белая Русь» ад сапраўднага да будучыні: захаванне і развіццё патэнцыялу ў сацыяльнай сферы». У абмеркаваннях прымаюць удзел дэпутаты Парламента, прадстаўнікі мясцовай улады, члены аналітычнай групы «Белая Русь», супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, прафесарскі і выкладчыцкі склад ВНУ, актывісты аб'яднання.




**Ульяна БУШУЙ**

Ульяна Бушуй. Вытокі пачынаюцца са слова